С. Р. ЦАРЫК
Столінскі р-н, ДУА «Лядзецкі вучэбна-педагагічны комплекс яслі-сад – сярэдняя школа»

У ПОШУКУ ПРАФЕСІЙНАЙ ПАСПЯХОВАСЦІ: АД ТРАДЫЦЫЙ ДА ІНАВАЦЫЙ

Паняцці “традыцыі” і “інавацыі” дыялектычна ўзаемазвязаны. Традыцыі існуюць як база для інавацый, а інавацыі служаць для зараджэння традыцый.

У рамках нашай установы адукацыі на працягу многіх гадоў вядзецца актыўная гісторыка-краязнаўчая дзейнасць. Асноўным метадам гэтай дзейнасці з’яўляецца метад праектаў (праектная дзейнасць). У практыцы работы настаўнікаў ён стаў важным элементам педагагічнай традыцыі, які выкарыстоўвае 75 працэнтаў педагогаў. У накірунку гісторыка-краязнаўчай дзейнасці ў розныя гады намі дасягнуты значныя поспехі на раённым, абласным і рэспубліканскіх узроўнях. Вучні ўстановы адукацыі былі пераможцамі I этапу абласнога патрыятычнага марафону “Возьми, мой внук, в наследство память”, абласнога этапу конкурса экскурсійных маршрутаў “Пазнаём Беларусь разам”, рэспубліканскага грамадзянска-патрыятычнага праекта “Збяры Беларусь у сваім сэрцы”. Паспяховасць гісторыка-краязнаўчага накірунку праз праектную дзейнасць тлумачыцца эфектыўнасцю ўзаемадзеяння педагогаў, вучняў і іх бацькоў, якія з жаданнем становяцца актыўнымі памочнікамі і ўдзельнікамі. Дзякуючы цеснаму ўзаемадзеянню педагогаў – бацькоў прыкладаюцца намаганні, каб дзейнасць давала магчымасць не толькі для развіцця пазнавальнай актыўнасці навучэнцаў, але і дапамагала ў далейшай сацыялізацыі. Праектная дзейнасць – гэта дзейнасць, якая мае асобасны сэнс для вучня [1, с. 146]. Акрамя гэтага яна мае і высокі выхаваўчы патэнцыял, паколькі заснавана на вывучэнні рэгіянальных гісторыка-краязнаўчых аб’ектаў.

Мэта дзейнасці любой установы адукацыі – павышэнне якасці адукацыі праз абнаўленне педагагічнай дзейнасці, развіццё прафесійнай кампетэнтнасці кадраў. Яе дасягненне магчыма пры ўмове ўдзелу педагогаў і вучняў у інавацыйных праектах. Для педагога, якія працуе ў школе, на сучасны момант інавацыйная дзейнасць – неад’емны кампанент асабістай педагагічнай сістэмы. Таму, калі калектыву было прапанавана прыняць удзел у рэалізацыі рэспубліканскага інавацыйнага праекта, то ні ў кога не ўзнікла сумненняў, ці патрэбна гэта нам. З 2015 года на працягу трох гадоў мы актыўна працавалі над рэалізацыяй праекта “Укараненне мадэлі вуснагістарычных даследаванняў роднага краю як сродку развіцця

сацыяльна-грамадзянскіх кампетэнцый вучняў”. Была распрацавана мадэль метадычнай работы ва ўмовах інавацыйнай дзейнасці, пачалося стварэнне інавацыйнага адукацыйнага асяродку, фактары якога прама ці ўскосна ўздзейнічаюць на асобу педагога і вучня, паколькі ў ім навучаюцца і развіваюцца і педагогі, і вучні. Наладзілі інавацыйнае ўзаемадзеянне, якое патрабавала ў першую чаргу павышэння планкі прафесійнай кампетэнтнасці педагогаў.

Былі запушчаны механізмы навукова-метадычнага суправаджэння па авалоданні педагогамі і навучэнцамі неабходнымі тэарэтычнымі ведамі па тэме інавацыйнага праекта і навыкамі вуснагістарычных даследаванняў. Ажыццяўленне ішло праз работу праблемнай групы і пастаянна дзеючага семінара для педагогаў. Для вучняў дзейнічала “Студыя журналіста”, дзе педагогі-філолагі вучылі іх правільнай фармуліроўцы і пастаноўцы пытанняў. Працавала адкрытая інфармацыйна-кансультацыйная пляцоўка “Адкрыты мікрафон” і “Скарбонка ідэй”, дзе вучні маглі задаць любое важнае для іх пытанне і падзяліцца першым станоўчым вопытам інавацыйнай дзейнасці. Праводзіліся спецыяльныя заняткі па авалоданні методыкай вуснагістарычных даследаванняў і практыка-арыентаваныя мерапрыемствы: “Гуляем у прэс-канферэнцыю”, “Рыхтуем навіны”, “Студыя тэлежурналіста”, накіраваныя на асобаснае развіццё і развіццё сацыяльна-грамадзянскіх кампетэнцый вучняў.

У практычную дзейнасць па вывучэнні малавядомых старонак гісторыі роднага краю ўключыліся педагогі, вучні, бацькі і сацыяльныя партнёры.

Вынікам сумеснай работы стала стварэнне банка відэаматэрыялаў інтэрв'ю са старажыламі вёскі аб асаблівасцях заняткаў жыхароў вёскі, святкавання каляндарна-абрадавых свят і культуры харчавання вяскоўцаў у мінулым, гісторыі калгаснага будаўніцтва. Арганізавалі работу клуба "Юныя экскурсаводы". Яго членамі распрацаваны і праводзяцца тэматычныя экскурсіі “Ад прадзедаў, спакон вякоў, нам засталася спадчына”, “Заняткі жыхароў вёскі Лядзец і яе ваколіц” у этнаграфічным пакоі, дзе можна азнаёміцца з асаблівасцямі хатняга інтэр’еру, прыладамі працы, посудам і мэбляй канца XIX і першай паловы XX стагоддзя.

Навыкі авалодання распрацоўкай апытальнікаў для гутарак са сведкамі гістарычных падзей (іх роднымі і блізкімі) і правядзеннем інтэрв’ю далі вучням больш шырокія магчымасці ў раскрыцці гіпотэз індывідуальных даследаванняў. Вусныя гістарычныя сведчанні сучаснікаў і ўдзельнікаў падзей ёсць “жывая гісторыя”, якая дазваляе захоўваць сваю ідэнтычнасць. Яны з’яўляюцца важным каштоўным матэрыялам для падрыхтоўкі і напісання вучнёўскіх вучэбна-даследчых работ гістарычнага, краязнаўчага, філалагічнага накірунку; дазваляюць пераадолець важную практычную праблему – наладжванне сувязі

пакаленняў для перадачы каштоўнасцей, традыцый нацыянальнай культуры і гісторыі [2, с. 53].

У 2016-2020 гадах на раённую навукова-практычную канферэнцыю “Адкрываю свет – адкрываю сябе” былі прадастаўлены вучэбна-даследчыя работы “Дыялектныя асаблівасці мовы жыхароў вёскі Лядзец” і “Асаблівасці выхавання дзяцей і падлеткаў вёскі Лядзец у канцы XIX пачатку XX стагоддзя” (дыпломы I ступені). Праект “Тапанімічныя назвы вёскі Лядзец” прыняў удзел у конкурсе даследчых і творчых работ "Тут родныя трымаюць карані", арганізаванага рэдакцыяй часопіса "Роднае слова". Па выніках конкурсу праект адзначаны дыпломам III ступені. Прадукты праектнай дзейнасці краязнаўчага характару і вуснагістарычных даследаванняў у 2019 годзе былі прадстаўлены на XVIII Рэспубліканскай выставе навукова-метадычнай літаратуры і педагагічнага вопыту ў рамках Года малой радзімы.

У 2018 годзе мы адкрылі для сябе мадэль адукацыйнага падарожжа як спосабу фарміравання метапрадметных кампетэнцый вучняў. З групай вучняў VII-VIII класаў у пазаўрочны час быў рэалізаваны праект адукацыйнага падарожжа “Я вырас тут, і край мне гэты дарагі”. Аўтары праекта прымалі ўдзел у II Міжнародным конкурсе прафесійнага майстэрства педагогаў “Пазнанне ў сатворчасці” і адзначаны Пахвальнымі лістамі.

З 2019 года ўстанова адукацыі ўключылася ў рэалізацыю новага інавацыйнага праекта “Укараненне мадэлі рэгіянальнага кластару як умова прафесійнага самавызначэння вучняў па запатрабаваных у рэгіёне прафесіях і спецыяльнасцях.

Рэалізацыя гісторыка-краязнаўчай дзейнасці праз метады праектаў, вуснай гісторыі і адукацыйныя падарожжы садзейнічае фарміраванню вучэбна-пазнаваўчых, камунікатыўных і сацыяльна-грамадзянскіх кампетэнцый вучняў і выхаванню беражлівых адносін да культурна-гістарычнай спадчыны роднага краю.

Спалучэнне традыцый і інавацый дае імпульс да павышэння прафесійнай кампетэнтнасці педагогаў, вызначае накірункі іх прафесійнага росту і творчага пошуку, садзейнічае асобаснаму росту кожнага вучня і дасягненню імі высокіх творчых і інтэлектуальных вынікаў. Чарговая высокая прыступка вучняў – правільны шлях у пошуках прафесійнай паспяховасці кожнага педагога.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Запрудский, Н. И. Современные школьные технологии/ Н. И. Запрудский. – Минск: Сэр-Вит, 2006. – 288 с.

2. Корзюк, А. А. Выкарыстанне вусных крыніц пры навучанні гісторыі/ А. А. Корзюк // Беларускі гістарычны часопіс. – 2014. – № 12. – С. 44